

*Васіль Ткачоў*
*Ганаровы грамадзянін Рагачоўскага раёна (2016).*

# Апавяданні

## ПЕРФАРАТАР – ХУЛІГАН І ВЫРАТАВАЛЬНІК

Сцяпан Ціханчык жыў адзін. Кватэра ў яго была на другім паверсе, двухпакаёўка, і з таго часу, як жонка і маці ягоных дваіх дзяцей паехала на курорт і не вярнулася, больш з прадстаўніцамі слабага полу спраў не меў. «Усе яны на адзін капыл – толькі абабраць і зняважыць, спляжыць, як жыватворнае і квітнеючае дрэва, мужчыну. Нагі больш не будзе жанчыны ў маёй кватэры! Запомніце!..» І хоць ён так катэгарычна заяўляў сам сабе і біў кулаком у грудзі, жанчыны ўсё ж ў кватэры тады-сяды ў яго былі. Вось і сёння, якраз за некалькі гадзін да Новага года, зазірнула суседка Дзіна. Яна ўтапіла кнопку званка, пачакала, але калі прыслухалася і за дзвярыма не пачула крокаў гаспадара, таўханула дзверы, і тыя паслухмяна адчыніліся. Суседка, мусіць жа, падумала: «Дзіўна! Каб ён, Сцёпка, і не зачыніўся! Зварʼяцець можна! Хіба што здарылася?» А Ціханчык мыўся ў ваннай. Цурчэла вада, а тут яшчэ нехта ў доме на ўсю моц эксплуатаваў перфаратар, то дзе там пачуеш, што выдавілі з сябе тонкі піск дзверы і шоргат крокаў суседкі. Здагадаўшыся, дзе гаспадар, суседка, высока падымаючы ногі, асцярожна падыйшла бліжэй да дзвярэй у ванны пакой, і ўяўляючы мужчыну з намыленай галавой, загаманіла да яго:

– З глузду зʼехаў нехта! Колькі можна! Жах! І так цэлы дзень тарахціць! З раніцы да вечара! Ці ёсць у чалавека сумленне? За што ж такое пакаранне?! Хто скажа? Хоць бы ўжо перад святам утаманіўся! Не наеўся – не наліжашся. Ні тэлевізар дома паслухаць, ні цябе пачуць... Сцяпан Пятровіч! Ты мяне чуеш? Ты дзе?

Якраз у гэтае імгненне сціх перфаратар і амаль сінхронна Ціханчык выключыў ваду, таму ён пачуў суседку, адказаў:

– У ваннай я! Мыюся.

– Табе, можа, спінку пацерці? – пырскнула смехам Дзіна і затуліла рот далоняй:божа, што я кажу, ці не лішняе?

–Я сам!

– Прабач, я ж зусім забылася: ты ж у нас – Сам. – Дзіна села на табурэт. – Дзіўна, а з якога часу ты стаў гэтым самым Самам, а, Сцяпан Пятровіч?

З ваннага пакоя пачулася бурклівае:

– Не замінай, кажу, я мыюся.

Дзіна ўздыхнула:

– Хоць чаго ж тут гадаць? З таго часу, відаць, калі першыя крокі зрабіў: пусціце мяне – я сам... Я сам, я сам, я сам... і пабег... і пайшло-паехала... Усё за дзяцей рабіў. Нават урокі: пусціце, я сам, вы няправільна задачку рашыце! Ну, і каго выгадаваў? Носу не паказваюць дзеткі. Ты нават Васілісе не дазваляў у школу хадзіць на бацькоўскі сход: я сам! Яна хоць ведала, у якой школе твае выпладкі вучыліся? А, Сцяпан Пятровіч?

–Выйдзі!

– Ого! Гоніш? Нават так? – суседка ўсхапілася і зноў села. – Так-так-так-так! Дзверы ж былі не замкнёны, між іншым. Уваходзь, хто пажадае! Я і ўвайшла. Як гэта так – чалавек лезе ў ванную, а дзверы не замкае? У цябе ўсе дома, сусед? Гэта добра, што я зайшла. А калі б хто іншы? А, маўчыш? Ты там не захлынуўся выпадкова? Ты нават вады з ваннай нікому не дасі сербануць, ведаю цябе: я сам!

У адказ суседка пачула:

–Не замінай мне думаць!

– Добра, не буду, – жанчына пахадзіла па калідорчыку, зноў села. – Хоць што ў цябе тут красці! Ні тэлевізара, ні пральнай машынкі... У цябе што, нават тэлефона няма?

– Ідзі дахаты! – яшчэ больш гучна папрасіў-параіў Ціханчык.

– Не, не пайду: а раптам табе ў ваннай дрэнна стане? У такім узросце не жартуюць! Усё ж мы суседзі, прытым не маладыя ўжо – павінны клапаціцца адзін пра аднаго.

– Зачыні дзверы з таго боку, смала!

– Не, не зачыню. Не рызыкну. Я калі ў ванную запаўзаю, абавязкова прашу каго-небудзь, каб пасядзеў у пакоі – а раптам?.. Гады ж! Ціск і ўсё такое. Ды ты сам, чуеш, сусед, пару разоў дзяжурыў у мяне ў мой лазневы дзень. Забыўся хіба? Не, не пайду: а раптам табе ў ваннай сапраўды дрэнна стане?

Нарэшце Ціханчык скончыў мыцца, выйшаў з ваннай, з'явіў:

– Мне стала добра. Пад перфаратар і тваю ахінею.

– З лёгкай парай! – кіўнула Дзіна.

Толькі б пагаварыць, а тут зноў невыносна моцнае стракатанне перфаратара. Дзіна ўзялася за нахабнага перфаратаршчыка не на жартачкі:

– З гэтым трэба канчаць! Неадкладна! Усё, хопіць! Надакучыла! Ні тэлік паглядзець, ні па тэлефоне пагаварыць! Генацыд! Самы сапраўдны! Зараз жа іду шукаць гэтага ўзурпатара! Усе кватэры абследую, да ўсіх дзвярэй вуха прыстаўлю, але выведу яго, гада, на чыстую ваду!

–Не тарабань хоць ты! – строга запатрабаваў Ціханчык. – Тут з вамі кранупца можна! Астынь!

– Добра, ага...Дай чым у вушах пакалупацца – у мяне палачкі з ватай скончыліся! Каб чутнасць лепшая была.

– Я сам!

–Што ты сам? Вушы мне прачысціш?

– Разбяруся і прыму меры.

– О, ціха стала! Чуеш? – суседка ажно затрымала дыханне і замгнула вочы. – Га? Чуеш?

– Гэта ненадоўга.

– Самы час нам пагаварыць... Пакуль ціха... Можа, я прынясу графінчык, Сцяпан Пятровіч, га?

– Я сухі...

– Выдатна! Выдатна! Ты выйшаў з ваннай, з вады– і сухі! Не кожнаму падфарціць.

– Я... я сухі закон вытрымліваю, – заікнуўся Ціханчык. – Ці табе не ведаць?

– А чым жа мне цябе тады ўзяць? І колькі можна сябе за дзяўчынку выдаваць? Звычайна мужыкі клююць, як карасі на чырвонага чарвячка, на бутэлечку, а, Сцяпан Пятровіч? З чаго пачнем? Ну, можа... так, а? – Дзіна раптам агаліла сцягно, і Ціханчык замахаў на яе рукамі, як на пракажоную: не-не-не, толькі не гэта!...

Ён хацеў ёй яшчэ нешта сказаць, але толькі хаўкаў ротам – не знаходзіў слоў. І калі зноў затарабаніў перфаратар, Ціханчык перахрысціўся, заўсміхаўся, і ў гэтым пошуме быў чуваць яго радасны і пераможны голас:

– Давай! Давай, братка! Ратуй мяне! Ты мой выратавальнік! Газуй не спыняючыся! Сцены вытрымаюць!

Дзіна нічога не разумела. «Што ён вярзе? Мыліць шыю трэба таму ідыёту, на ягонай галаве перфаратар размалаціць варта!» А потым усё ж здагадалася, што да чаго – Ціханчыку лепей было слухаць тарахценне той штуковіны, чым яе заляцанні. Калі перфаратар

дзяўбе сцяну недзе ў суседняй кватэры, тады было не чуваць жанчыны, і гэта старога жонаненавісніка надта радавала. Хоць ён і сам не адразу зразумеў, што перфаратар – яго выратаванне ад назойлівай суседкі.

Дзіна, роспачна ўздыхнуўшы, моўчкі, але энергічна выйшла. Ціханчык правёў яе шчаслівым позіркам. Новы год яны зноў не будуць сустракаць разам. А Новы год, вядома, як сустрэнеш, так і правядзеш...

Перфараташчыку ж на ўсялякі выпадак Ціханчык прыгразіў:

– Ну, а калі цяпер будзеш мне хуліганіць – знайду і сам асабіста разбяруся! Чуў? Ты сваю справу зрабіў, дзякуй, а цяпер – ша мне, каб ні пікнуў!..

І ён шырока ўсміхнуўся – парадаваўся ж, пэўна, што сваё слова трымае. Дзівак, канешне. А мо проста – дурань?

## СТРАХ БАБЫ ЛІДЫ

Тады ёй было сарок. Сёння – семдзесят пяць. Худзенькая, жвавая, востранькая на язычок – пашукаць такіх, як яна, трэба. Жыве адна, а гаспадарку трымае немаленькую – карову, парсючка, з дзясятак курэй. Не ў залік кот чорнай масці Мартын і крутога нораву сабака Сідар. Пенсію атрымлівае «як усё», хапае, кажа, на хвост селядца і цукар. Няма, праўда, у старой, па яе мерках, ніякай раскошы – ні тэлевізара, ні радыё. Здароўем Бог не пакрыўдзіў, раней іншы раз нават хвалілася: «Гэта, відаць, таму не хварэю, што Іван біў часта – прыстасаваўся арганізм, загартаваўся.» У апошні час пра здароўе памоўчвае... Так, Іван сапраўды калаціў яе жорстка. Трывала. Цярпела спярша, а пазней і жалілася шмат у якія інстанцыі, а карысці ніякай: памірыцеся, не маленькія. А міру таго не было. І тады яе цярпенне, як кажуць, лопнула – Ліда рашылася на крайні крок... Задумала разлічыцца з Іванам сама. І – верыце? – разлічылася. Цішком, нікога не пасвяціўшы ў страшныя справы. У вёсцы, праўда, здагадваліся, што не проста так здаравяк Іван з зямелькаю пабраўся, волат такі, бык, ды яму ж зносу не павінна б быць. На Ліду думалі. Правільна думалі. Але ўслых ёй не казалі, так, між сабой пагамоняць бабы-дзеўкі, ды і рот за замак: яе справа, калі на тое адважылася, то Івану так і трэба. Паздзекаваўся над беднай бабай – досыць, хай цяпер зямлю парыць.

Трыццаць пяць гадоў парыць. Мы з сядзім з бабай Лідай у яе ўтульнай хацінцы, п'ем чай. Суседзі ж. Прыехаўшы да бацькоў, зазірнуў і да яе на агеньчык, прынёс сваю новую кнігу. Ведаю, чытаць не будзе, не прывучана, а прыемнае старой зраблю. Яна маю кнігу паклала чамусьці за бажніцу.

У той вечар я і задаў ёй пытанне, якое збіраўся задаць даўно, ды і не толькі я, мабыць. Спытаў асцярожна, нібы паставіў нагу на міннае поле:

– А ўсё ж, Пятроўна, Іван як на тым свеце апынуўся, калі не сакрэт? Па Божай літасці ці?..

І тут жа, не даўшы асэнсаваць старой свае словы, падстрахаваўся:

– Яно, можа, і правільна... Чым такому чалавеку жыць...

Уздыхнуў, падняў вочы на суседку. Нашы позіркі сустрэліся. Яе вочы, на маё здзіўленне, засвяціліся, у іх не было боязі, страху, і, як падалося, яна нават узрадавалася майму пытанню. Падобна, даўно чакала гэтага моманту – нарэшце, нарэшце распавесці каму-небудзь пра усё, як было. А тут падвярнуўся і я. Ну, дык слухаю, баба Ліда.

Падбіўшы кашчавымі пальцамі валасы пад белую – у гарошак – хустку, яна ўздыхнула, ціха мовіла:

– Ты ж малы быў, калі прыняла я Івана. Смаляк ён. З Сафонава. Сядзеў. Спярша не прызнаваўся, а потым раскрыўся. Аліменты не плаціў на дзяцей. Настругаць настругаў, а карміць не жадаў. Дык яго падпільнавалі і арыштавалі. Колькі сядзеў – не казаў. Пачну толькі пытаць, насупіцца: а табе не ўсё адно? Тады, пасля вайны, модна было мужыкоў прымаць – сваіх загубіў фашыст праклятушчы, дык разграбалі бабы тых, хто нямаведама адкуль звальваўся на іх галаву. Мне вось Івана параілі. Мужык з выгляду нічога быў, помніш жа. Дужы мужык. І прывабны. Але ўжо пасля першай яго сур'ёзнай п'янкі я зразумела, каго прыняла: адмалаціў ён мяне добранька. Пытаю: «Навошта ж так? За што?» Адказвае, не міргнуўшы і вокам, паразіт: «Каб ведала, што мужык у хаце ёсць». А потым пайшло-паехала: ледзь кропля ў рот – кулакі ў ход. Праганяю, а не ідзе, паразіт. Мне, кажа, ісці няма куды. Куды ж я пайду, Лідка, кажа. А самой і боязна траха, што возьме ды і напраўду сыдзе. Не пацягнуць мне адной гаспадарку. Які ні які, а – мужык. Лупцуе ён мяне не кажан дзень, а робіць, як конь, амаль кажан. Змірылася: буду трываць. Калі і так дрэнна, і гэтак. І трывала.

А потым справа гэтая здарылася... ну, пажар. Хату настаўніка падпаліў. П'яны. Ён-та і не памятае нічога. На судзе патлумачыў: мне, кажа, зайздросна было, што настаўнік добра жыве, а я ў калгасе за голы працадзень спіну гну, у ляпёшку разбіваюся. Цвярозы задумаў, а п'яны зрабіў. Вядомая справа. Суддзя быццам бы казаў тады, каб настаўнік пад гарачую руку яго ўкакошыў, калі Іван звязаны на траве круціўся, як уюн, то і нічога б не было яму, настаўніку. Прабачылі б. Не было б і Івана. І ўсё добра скончылася б. А то я ўзяла грэх на сваю галаву. Але да граху мы яшчэ жылі ого-го колькі! Чатыры гады далі яму за пажар. Не падпальвай. А як жа. Не бяры запалкі

ў рукі, калі розуму няма. У турму ездзіла аж два разы, а так больш пасылкі адпраўляла і прасіла каго, каб ліст адпісаў – тут недалёка сядзеў, у Оршы. Кляўся, калі сядзеў, што ўсё, адумаўся, завязаў... гэтым самым... марскім вузлом, ага. Прыеду, кажа, хату ператрасём, на цагляны падмурак паставім, хляўчук новы пабудуем. Ён, праўда, тут не схібіў, не падвёў – і хата, сам жа бачыш, як новя... Звон хата. Цацка. Бярвенне новае амаль усё даў. Але ж дужа страшны быў, калі напіваўся. Звер, а не чалавек. А гэта яшчэ гледзячы і які звер. Іншага звера і пакрыўдзіць можна, з ім параўноваючы. Часцяком, калі паспявала, хапала я падушку і бегла ў агарод начаваць... калі ўлетку... прытулюся дзе зручней, і сплю. Толькі які ж гэта сон?! Не спалася, не. Хіба ж можна спаць, калі на душы мулка, калі ўсё цела дрыжыць ад страху? Не заснеш. Ніяк не заснеш. Узімку па адрынах хавалася. То на сваю залезу, то да калгаснай прыткнуся. Знаходзіў, было, а як жа, сцягваў, і тады біў, біў, біў... Ох і біў! Бакі балелі, ручанькі – як не свае былі. Вядро з вадой падняць не магла. Твар знявечыць. Людзі мяне, адчувала, шкадавалі. Не ўсе, але былі такія. А чым яны мне, скажы вось, дапамагчы маглі? Чым? Ай!... Участковы Мішка Булашоў, хлусіць не буду, раз колькі прыходзіў, даваў прачуханку Івану. Лаяў. Паклянецца пры ім больш не чапаць мяне. А сам стукае ў грудзі і кажа ўчастковаму: «Ды ні я, ні я Лідку пакалаціў учора – гарэлка праклятушчая!»

Мы і мірна з ім, з Іванам, гутарылі. Сыходзь, кажу, Іван, дажыву свой век як-небудзь ужо сама. Пляменнікі ў мяне ёсць, сваіх дзетак Бог не даў, ведаеш жа. Яны падмогуць, пляменнікі. Падраслі – не маленькія. Будуць з горада наглядваць. А ён не ідзе. А потым, як вып’е, дык абавязкова ўзгадае, паразіт, што выправоджвала яго. І гваздане паміж вачэй так, што доўга іскры потым сыпяцца. Мне б пабоі зняць, дурніцы, ды пасадзіць яго трэба было б – і ўвесь сказ. Хоць што тут лепш, што горай – сказаць цяжка. Адседзіць і вернецца. Здаровы, кажу ж, быў. Якая зараза возьме яго ў той турме?

Адзін раз... во, успомніла... такое не забудзеш... у бальніцы ці з месяц адыходзіла. Сёння, можа, і забралі б яго, а тады, трыццаць пяць гадоў назад, калі яшчэ і Гагарын у космас не лётаў, ніхто такіх, хто жонак ганяў, не арыштоўваў. Сыходзіла. І тады, у бальніцы, я цвёрда рашыла... забіць Івана. Так, так, забіць: цярпенню настаў канец... А як забіць – не ведала. На яго ж з кулакамі не накінешся. Ды што з кулакамі – з сякерай не падступішся: адыме сякеру, ёй жа цябе і заб’е.

А тут сам выпадак падвярнуўся. Замяняла я тэхнічку ў школе. Дзеці нейкія досведы па хіміі рабілі, у каморку да мяне на зберажэнне кіслату прынеслі. На вялікім слоіку было напісана: «Саляная». Ага, думаю, а дай паспрабую...Адліла я трошкі яе, кіслаты, небагата

адліла ў бутэльку, прынесла дахаты і схавала. І штосьці адразу страшна стала, трэсці ўсю мяне пачало. Не, думаю, не мая гэта справа – забіваць чалавека, нервы слабыя. Але крыху пазней Іван сам мяне канчаткова падпіхнуў на злачынства – збіў на горкі яблык у чарговы раз, ледзь жывая засталася. Тады самі рукі пацягнуліся да бутэлькі з атрутай. Недапітая бутэлька з віном якраз пад сталом стаяла, а Іван, пахістваючыся, выйшаў па патрэбе ў двор. Ён ужо добранькі быў. Тады ж я, улучыўшы момант, дрыготкай рукой лінула кіслаты ў горлачка... колькі не памятаю... проста капнула, відаць, ды горлачка зацёрла анучай. Не здагадаўся б толькі. Рызыкавала, ох і рызыкавала. Ён бы мне, даведайся толькі, усю кіслату тую ў рот выліў бы, далібог. А Іван, паразіт, апрыходаў рэшткі віна, і хоць бы хны яму. Чакаю, калі памрэ, а яго ніякая трасца не бярэ. Нават не кашлянуў. У наступны раз дабавіла пабольш. Пачаў жаліцца на рэзь у жываце. Але нядоўга. Акліматаўся. Ох, аднойчы і нацярпелася ж я! Гэта ж добра, што Іван і сусед Мітрафан ужо цёпленькія прыйшлі. А я загадзя прыгатавала бутэльку. Адліла з яе на палец віна, добранька адліла, ледзь не паўшклянкі, а замест яго – кіслоты ў бутэльку бухнула: чаму быць, таго не абмінуць! І затыкнула акуратненька. Уваходжу ў хату, а ён якраз у гэты час пачынае частаваць Мітрафана з той самай бутэлькі. Як толькі глянула я на стол – у мяне і голас прапаў, і ногі адняліся. Тады я хрась з усяго размаху па шклянках, яны разам з віном на падлозе апынуліся. Мужчыны на мяне глядзяць і нічога не разумеюць. Разліла віно, хоць і ведала, чым усё гэта абернецца для мяне. Мітрафана пашкадавала. Дужа кволы ён і добры чалавек. Ён бы спруцянеў і казаць няма чаго.

З месяц я труціла Івана. Цяжка паміраў. Ляжаў на ложку і енчыў, прасіў усё, маліў: «Выратуй, Лідка! Усе грошы, да капейкі, аднясі дактарам, хай выратуюць мяне! Ты чуеш, сцерва дохлая?» Я чула. Не глухая. І хоць мне шкада стала яго – чалавек усё ж – а не ратавала. Памірай. Хай, думала, і ён гэтульки папакутае, колькі я ў свой час нацярпелася ад яго. Ды ў мяне і на яго памінках увесь твар ў сіняках... крывавых... быў... Людзі зманіць не дадуць.

А памёр, суседзяў паклікала, спехам адпелі і закапалі. Гэта каб у горадзе, то ў лякарню павезлі б, рэзаць пачалі... даследваць – па якой прычыне і як памёр. А ў нас, у вёсцы, адно даследаванне – магіла.

Хай ведаюць усе: гэта я адправіла Івана на той свет. Хоць людзі, пэўна, і здагадваліся. Не дурні ж. Але ўсё адно напішы, сусед. Напішы. Судзіць мяне ўжо ніхто не будзе. Не дакажуць. Згніў, відаць, Іван увесь. Што там ад яго засталося? Ды і позна мяне судзіць – паміраць сабралася. Адзежу прыгатавала. Чуе сэрца, што не перазімую: астма мучыць. А паміраць, прызнаюся табе, сусед,

баюся – не, не самой смерці, а сустрэцца з Іванам там баюся. Душата яго жывая, відаць. А, можа, і сам у поўны рост сустрэне? Вось з такімі кулакамі?.. Цьфу-цьфу-цьфу!..

Калі ж ніхто ж адтуль не прыйшоў і не распавёў, як там людзі жывуць, чым займаюцца. Сніцца часта пачаў Іван. Чакае, мусіць. Ох, і адпомсціць, паразіт, ён мне на тым свеце. Ён не даруе. Як думаеш, сусед?

...Вярнуўшыся дахаты, я доўга не мог заснуць. Думаў пра бабу Ліду, пра яе страх перад апошнім парогам. Думаў пра жыццё. Сапраўды так: складаная яна рэч – жыццё. Надта. І хто ў ім мае рацыю, хто вінаваты – рассудзіць можа, відаць, толькі сам Бог.

## ПРАВОДЗІНЫ

Антонавіч чакаў унука Максіма. З хвіліны на хвіліну той павінен быў забегчы, каб развітацца. Унук ішоў у армію. Стары пашоргаў да акна, паглядзеў на двор, запруджаны легкавікамі. Людзей сярод іх сноўдалася мала, у асноўным, хіба ж не бачна, пенсіянеры нетаропка накіроўваліся ў бок ашчадбанка і аддзялення сувязі, яны побач, – каб атрымаць пенсію. Яшчэ ўчора пачалі выдаваць. І яму б схадзіць, але занядужыў. Хварэе і жонка: яе наогул забрала колькі дзён назад «хуткая». Нічога, разважаў Антонавіч, пенсія пачакае, цалей будзе. Сёння ў яго галоўны клопат – унук. Зноў паглядзеў у акно: не відаць. Хацеў было пацікавіцца, чаму затрымліваецца, пацягнуўся за мабільнікам, але перадумаў: хіба ж у яго, Максіма, мала спраў? Прыбяжыць. Як гэта – каб дзеда абмінуў? Такога не можа быць – у іх свае стасункі, яны – дружбаны яшчэ тыя. Пакуль унук недзе бавіцца, Антонавіч думае пра ўнука. Дзіўны ён усё ж хлапец. Але – малайчына. Калі нехта стараецца скасіць ад арміі, той даўно, яшчэ некалькі год назад, заявіў: пайду служыць! Абавязкова! І толькі ў дэсантнікі! Звязаўся нейкім чынам з такімі, як сам, экстрамаламі, скакаў з моста праз Сож, ездзіў у Васілевічы, каб і там скокнуць з закінутай вежы. Потым усё гэта выклаў у інтэрнэце, пахваліўся і дзеду. У Антонавіча быў здзіўлены твар, ён і не пахваліў унука і не лаяў, а толькі падумаў: «І па кім ён пайшоў? Хіба ж я з той вежы скокнуў бы? Ды нізашто! Забі мяне, а не адважуся...» Пазней, праўда, сваю боязь апраўдваў гадамі, старасцю, а каб быў маладым, як Максім, магчыма б таксама адважыўся. Хто яго ведае – як было б, калі б ды каб... А ён вось, унук, меціў у дэсантнікі. Гантэлі неяк прынёс. «Дзед, не хочаш пазаймацца?» Антонавіч адно што ўсміхнуўся ў адказ: «Мне яшчэ толькі гэтага не хапала!» Аднак з дэсантам у Максіма нічога не атрымалася: медыцынская камісія была супраць, не дала дабро, і тады яму прапанавалі вучыцца ад ваенкамата на вадзіцеля. Паспры-

яла гэтаму, відаць, і тое, што ў яго меліся на той час правы аматара. Тут наогул цікава атрымалася. Пасля школы Максім аднёс дакументы ў прафесійна-тэхнічны каледж, дзе навучаўся па двух спецыяльнасцях – майстар па халадзільных устаноўках і слесар-зборшчык. Практыку праходзіў на заводзе ліцця і нармаляў, там хлопца заўважылі і прапанавалі пасля вучобы застацца ў іх. А куды было кідацца і сапраўды яму, калі наперадзе – армія? Пагадзіўся. За тыя пяць месяцаў, што працаваў слесарам-зборшчыкам, а не біў лынды, як некаторыя, вывучыўся і на шафёра-аматара. Ні ў каго ніводнай капейкі не папрасіў. Антонавіч неяк было заікнуўся, ці не дапамагчы яму грашыма, усё ж цяпер навука гэтая не надта танна каштуе, аднак той дэлікатна ўхіліўся: «Я сам, дзядуля, мне ж добра плацяць». Ну добра дык добра. Тое-сёе з адзення справіў. І набыў сабе смартфон амаль за чатыры мільёны рублёў. Вось гэтага Антонавіч не ацаніў. Навошта такая дарагая рэч, ды яшчэ перад арміяй? Унук жа спакойна заявіў: «У армію вазьму з сабой».– «Вазьмі, вазьмі, там цябе з такой цацкай толькі і чакаюць старaслужачыя – умомант адбяруць».– «Не адбяруць. Цяпер не той час. Я спраўляюся ў тых, хто служыў. Сказалі: бяры любы мабільнік, ніхто не пакваліцца. У капцёрцы ёсць сейф, там іх і захоўваюць. А даюць карыстацца толькі ў нядзелю. Ну, зразумеў, дзядуля?»

Што ж тут не зразумець. Шчыра сказаць, дык з «дзедаўшчынай» і ён не сустракаўся ў арміі, хоць і служыў калі – страшна ўявіць: амаль пяцьдзесят год назад. Прызваўся ў шэсцьдзесят сёмым, якраз армія, тады яшчэ савецкая, пераходзіла на двухгадовы тэрмін службы і ў казарме, калі ён прызваўся, былі старaслужачыя воіны, якія захапілі крышачку нават і чацвёртага года. Яны жылі дэмабілізацыяй і на вячэрнюю прагулку, вядома ж, не выходзілі. Аднак калі цікавіўся, як праходзіць у роце вячэрняя прагулка дзяжурны па часці афіцэр, то яны моўчкі бралі ў капцёрцы сваіх чарапах (служыў Антоновіч у Туркменіі), выносілі іх на плац – і колькі прапаўзе за час прагулкі чарапаха, столькі і яны пройдуць. Пацеха, не болей. Усё ж гэтых старaслужачых разумелі і многае ім даравалі: яны сваю вайсковую навуку засвоілі, нават крыху звыш таго, пара хлопцам дадому, і вы, маладыя, не глядзіце на іх.

Добра запомнілася яму, Антонавічу, і як першы Новы год сустракаў у казарме. Выстраіліся ў адну шарэнгу «салагі», «чарпакі» і «старычкі». З іншага пакоя – там, дзе стаялі ложкі – пасля каманды «смірна, раўненне налева!» – два салдаты вывозяць на палацёры старaслужачага са згорнутым лістом ватмана пад пахай. Той вітаецца: «Здрасце, таварышы салагі!» Салдаты адказваюць. Так вітаецца і з чарпакамі – салдатамі, што адслужылі год. Ну, а са старaслужачымі

камандуючы своеасаблівым навагоднім парадам вітаўся з кожным за руку. А потым разгортваў ліст ватмана і зачытваў загад па казарме... Усё гэта зводзілася да жартаў. Смеху было – не перадаць. Пазней прыходзіў у казарму камандзір роты і па-сапраўднаму віншаваў усіх з Новым годам.

Нарэшце з'явіўся унук.

– Ну што, дзед, давай развітвацца? – пераступіўшы парог, адразу усміхнуўся ён, і Антонавіч адчуў, як на вачах успыхнулі слязінкі.– З бабуляй развітаўся. Разам з Ульянай былі ў яе толькі што ў палацe. Сказала, каб ты сёння да яе не прыходзіў – у яе усё ёсць. Тата з мамай сёння ранкам былі ў бабулі, занеслі ёй што трэба.

– Куды ж я ўжо пайду?.. – стары зусім неяк скурчыўся, безнадзейна махнуў рукой, пэўны час глядзеў на Максіма і не бачыў выразна ягоны твар: вочы па-ранейшаму туманіла вільгаць. Калі здагадаўся змахнуць здрадніцкія слязінкі, мякка, але патрабавальна загадаў унуку: – Прысядзь.

– Ды няма калі, дзед! Мяне ж сябры чакаюць!

– Перад дарогай трэба пасядзець. Прысядзь, прысядзь. Нікуды твае сябры не дзенуцца.

– Яны і на прысягу прыедуць.

– Гэта добра. Значыць, харошыя хлопцы. Але калі яшчэ будзе тая прысяга, а ты мяне паслухай, старшага сяржанта запасу, зараз.

Максім лагодна ўсміхнуўся, сеў на табурэт:

– А я і не ведаў...

– А што, на картках не бачыў хіба мяне з лычкамі?

– Хаця праўда. Але неяк не прыдаваў значэння. Дзед – і старшы сяржант? Хм!..

– Так, так. У поўным запасе. На мяне там не разлічвайце... Не буду табе я нічога казаць. Хлопец ты разумны – сам усё ведаеш. Але нейкія праводзіны сёння ў армію не такія, як хацелася б... як раней былі... Ого раней праводзіны былі ў армію! Што ты! Калі я ішоў, то ўся вёска выходзіла на вуліцу, я да кожнага чалавека падыходзіў, і ўсе, усе, унук, як адзін чалавек, жадалі мне добрай службы... Многія абдымалі, а жанкі нават цалавалі і плакалі... Ну як я мог пасля гэтага схібіць, не так рабіць нешта ў арміі? І ўсіх так, як мяне, праводзілі... Усіх... Можа таму, што нацярпеліся людзі ў вайну, добра ведалі, што такое салдат? Амаль усе яны, землякі, вайну перажылі... Нацярпеліся... Хапіла ліха ім...

– Я пайду, дзядуля? – унук устаў з табурэта, абняў Антонавіча, адвярнуўся, і стары таксама ўбачыў на ягоным твары слёзы.

– Ступай, Максім, – ціха прамовіў Антонавіч. – Прабач, што не магу цябе правесці: занядужыў, як на тое ліха, бачыш жа.

– Ды што ты, дзядуля! Тата з мамай прыйдуць на вакзал да цягніка. Дзядзька Юрка.

– Ступай. З Богам!

За Максімам павольна зачыніліся дзверы, і Антонавіч сеў на той табурэт, на якім толькі што сядзеў яго ўнук. Пра многае хацеў яму сказаць, але дзе там – яму,бачце вы, неслуху, некалі: сябры чакаюць. І з сябрамі, вядома, трэба пабавіць час, без сяброў не пражывеш. І з дзяўчынай развітацца. Ён адзін, іх – многа...

– Калі ж сёння Максім нарасхват, усім патрэбны, – падумаў з гонарам Антонавіч. – І ў першую чаргу – Радзіме. Служы, салдат!..

Ён падышоў да шафы, узяў там пачатую бутэльку віна, напоўніў чарку. Але піць не стаў – перадумаў. Зліў віно назад у бутэльку, а ўслых сказаў:

– Старая вернецца з бальніцы, нядоўга засталося, тады разам і возьмем па кроплі. За салдата. Праводзіны ўсё ж...